Общепризнано мнение о вреде курения, которое является одним из основных факторов риска развития сердечно-сосудистых и других болезней. Как же часто курят студенты Белгосуниверситета? Количество курящих увеличивается от курса к курсу. Больше всего курят третьекурсники (28 %). К сожалению, многие студенты начинают курить в стенах вуза. Средний показатель количества курящих в университете — 23,3 %.

В нашем исследовании выявлена взаимосвязь между курением и успеваемостью. Корреляционная связь (по Спирмену) между этими двумя факторами существенная с достаточным уровнем достоверности ($P<0{,}05$). 24,7 % студентов, занимающихся (имеется в виду средний балл по итогам экзаменационных сессий) на 3 и 3,5 баллов, курят постоянно, в то время как среди студентов-отличников регулярно курящих всего 3,4 %.

Познавательный интерес имеет и оценка студентами своего здоровья. В этой оценке просматривается взаимосвязь с образом жизни студентов. Наиболее нерациональным он, по нашим данным, является на 3 и 4 курсах. На этих же курсах меньше всего студентов, которые оценивают свое здоровье как отличное или хорошее, но больше всего таких, которые считают свое здоровье средним или плохим.

Известно благоприятное воздействие на человека, его здоровье занятий физической культурой. А ведь в учебной программе четверокурсников даже нет обязательного курса физического воспитания. Самостоятельно занимаются физическими упражнениями ежедневно лишь 11,5 % первокурсников и 7,8 % третьекурсников, 60,3 % студентов четвертого курса занимается только изредка. Установлено, что студенты 3 и 4 курсов, у которых выявлено плохое состояние здоровья и которые сильно устают к концу учебного дня, очень мало занимаются или вообще не занимаются физической культурой и спортом. У старшекурсников высокая учебная нагрузка. Однако они не могут рационально организовать свое время, а потребность в регулярных физкультурных занятиях у них не сформирована.

Таким образом, анкетный опрос студентов университета помог выявить некоторые гигиенические аспекты их образа жизни: взаимосвязь между состоянием здоровья и курсом обучения, влияние занятий физической культурой на улучшение режима дня и успеваемость. Определены нерациональные факторы образа жизни студентов (питание, курение, недостаточная двигательная активность), отрицательное воздействие которых увеличивается от курса к курсу.

Назрела необходимость резко активизировать деятельность всех подразделений университета, ответственных за состояние здоровья и успеваемость студентов, по рационализации их образа жизни.

[1] См.: Агаджанян Н. А. Образ жизни и здоровье // Активный образ жизни и здоровье студентов. Ташкент, 1985; Афанасьев В. Г. Социалистический образ жизни: пути совершенствования // Политическое самообразование. 1986. № 6.

С. В. СНАПКОЎСКАЯ

## АБ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЦЁТКІ ПА АДРАДЖЭННЮ І РАСПАЎСЮДЖВАННЮ РОДНАЙ МОВЫ НА БЕЛАРУСІ

На працягу некалькіх вякоў, аж да рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, на Беларусі не было ніводнай школы з выкладаннем на роднай мове, за выключэннем невялікай колькасці тайных школ. На беларускай мове нельга было друкавацца, выдаваць кнігі, часопісы, газеты, весці справаводства. На гэтай мове размаўлялі толькі сяляне, таму ў літаратуры XIX стагоддзя яна гучала перш за ўсё як мова «мужыка» — цёмнага, забітага, абсмеянага, але не жадаўшага тым не менш адмаўляцца ад сваёй «халопскай» мовы. Такое становішча трапна ахарактарызавала «Наша ніва»: «Казалі, што беларускі мужык лічыць родную мову сваю за «халопскую», дрэнную, брыдкую, дык праз гэта ў сябе не бачыць чалавека, а толькі хама»[1].

Спрыяльныя ўмовы для пераўтварэння «мужыцкай» мовы ў беларускую літаратурную мову ўзніклі ў канцы XIX—пачатку XX стагоддзя, калі Беларусь перажывала нацыянальнае адраджэнне. На гэты перыяд прыпадае дзейнасць і творчасць таленавітай беларускай паэтэсы, асветніцы і педагога Цёткі (Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч, 1876—1916). Уся яе грамадска-педагагічная, літаратурная і асветніцкая работа была прасякнута

няспынным клопатам у імя высакароднай справы адраджэння і развіцця беларускай нацыянальнай культуры і мовы, навучання на роднай мове. У барацьбе за адукацыю беларускага народа Цётка з'явілася актыўным прадаўжальнікам ідэй і спраў Ф. Багушэвіча і адначасова саратнікам М. Багдановіча, Я. Коласа, Я. Купалы.

З'яўляючыся членам кружка РСДРП, Цётка прымала ўдзел у рэвалюцыйных падзеях 1905—1907 гадоў. Працуючы фельчарам у акружной псіхіятрычнай лячэбніцы ў Нова-Вілейцы, яна друкавала на беларускай мове пракламацыі, «ганьбаваўшыя цара», і распаўсюджвала іх. Выдавала свае вершы як рэвалюцыйныя лістоўкі і пракламацыі на беларускай, рускай і польскай мовах. Цётка прымала ўдзел у арганізацыі і выданні першай беларускай газеты для працоўнага народа «Наша доля», якая ўпершыню звярнулася да беларускага народа на роднай мове. Калі ў 1906 годзе стала выходзіць газета «Наша ніва», Цётка разам з Я. Коласам выступіла на яе старонках за стварэнне школ на роднай мове, супраць праследаванняў царскімі ўладамі настаўнікаў, што вялі навучанне на беларускай мове.

У артыкуле «Як нам вучыцца», яна пісала, што беларусы таксама будуць «людзьмі звацца». «Доўга мы, беларусы, цураліся сваёй мовы і, як кажуць, хаваліся з ёю за печ перад чужымі людзьмі. Вось і злажылася нейкая дурная пагаворка, што наша мова хамская, брыдкая, што на ёй не можна гаварыць з вучоным чалавекам, ані пісаць кніг, як на іншых «далікатных» мовах. Але гэта толькі выдумка». Аўтар артыкула заклікаў настаўнікаў новых пачатковых школ весці навучанне дзяцей па-беларуску, «каб тлумачылі ім ўсё па-тутэйшаму, па-свойму, як дзеці гавораць у хаце з бацькамі і як ім найлягчэй разумець»[2]. Засваенне дзецьмі роднай мовы, па яе думцы, дапаможа ім хутчэй авалодаць таксама рускай і польскай мовамі.

Галоўную ролю ў барацьбе за стварэнне беларускіх школ рэвалюцыйныя дэмакраты адводзілі народным настаўнікам, працаваўшым сярод народа і добра ведаўшым яго жыццё. Да ліку такіх настаўнікаў належыла і Цётка, якая разгарнула работу па стварэнню народных школ у Гродзенскай губерні. Некалькі школ яна арганізавала дома ў бацькоў, прыцягвала да выкладання ў іх прагрэсіўна настроеную моладзь. Адкрыццё беларускіх школ запатрабавала выдання кніг і вучэбных дапаможнікаў на роднай мове. Акрамя таго, многія тагачасныя падручнікі не адпавядалі ўзроўню развіцця дзяцей, часта былі сухімі, схаластычнымі па зместу. Разумеючы гэта, Цётка першай узялася за стварэнне вучэбных кніг для дзяцей беларусаў на роднай мове.

У 1906 годзе ў Жоўкве каля Львова пад псеўданімам «Тымчасавы» яна выдала кніжку на беларускай мове «Гасцінец для малых дзяцей», надрукаваную лацінскімі літарамі. Гэта кніга была перакладзена з украінскай мовы на беларускую з невялікімі зменамі, таму што матэрыялаў на беларускай мове яшчэ не было. У гэтым жа годзе ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» у Пецярбургу Цётка надрукавала кнігу «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Гэта кніга з'яўлялася дапаможнікам для дзяцей першага класа і працягам «Беларускага лемантара» — своеасаблівай беларускай азбукі. «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» — першая кніга, выдадзеная аб'яднаннем «Загляне сонца і ў наша аконца» (Пецярбург, 1906). Па некаторым крыніцам, аўтарам яе быў Карусь Каганец.

У працэсе работы над першымі кнігамі для дзяцей Цётка сутыкнулася з вялікімі цяжкасцямі, звязанымі з тым, што на працягу вякоў беларуская мова жыла і развівалася як мова гутарковая, мова народнай творчасці без уласнага алфавіту. Так, у лісце да Б. Эпімаха-Шыпілы ад 28 чэрвеня 1906 года у сувязі з выданнем «Першага чытання» яна зацікавілася: «Што чутна з букваром, ці ўжо гатоў, ці ў нас будзе фанетыка наша беларуская. Гэта вельмі важна»[3]. Цётка паклала ў аснову «Першага чытання» высокамастацкую мову Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Я. Купалы, Я. Коласа. Выкарыстала вывады этнаграфічных і лінгвістычных даследаванняў Я. Ф. Карскага, Е. Р. Раманава і другіх беларускіх вучоных.

У сваёй кнізе для дзяцей беларусаў Цётка імкнулася праўдзіва апісаць умовы, у якіх навучаліся дзеці Паўночна-Заходняга краю. У расказе «Мая вёска» яна пісала, што навучэнне дзяцей тут ішло «па-расейску» і па-польску. Гэта перашкаджала засваенню ведаў і ў выніку «выйшла каша». З жалем аўтар піша аб тым, што у адной сям'і дзеці «разам цураліся роднае мовы... Мову сваю перадражніваюць, гутаркі роднае стыдаюцца, над бацькоўскай гаворкай рагочуць». Аднак сялянам не было ўсё роўна, на якой мо-

ве размаўляюць і вучацца іх дзеці. Народ не згубіў яшчэ сваёй нацыянальнай самасвядомасці, не страціў любові да роднае зямлі і роднага слова. Вось і сабраліся сяляне разам, «памеркавалі» і вырашылі наладзіць сваю школу. Яны нанялі хату, «узялі вучыцеля беларуса, накуплялі кніг беларускіх і пачалі вучыць дзетак у сваёй вёсцы, у сваім вучылішчы ды сваёй мовай». З таго часу «пайшоў лад». І ў школе, і дома дзеці размаўлялі на роднай мове. Гэта аблягчала навучэнне, стымулявала цікавасць да беларускай культуры, да народнай творчасці. «Вернуцца дзеткі з вучэння, прынясуць з сабой казак, песняў, пачнуць бацькам чытаць...»[4]

У «Першым чытанні для дзетак беларусаў», якое складалася з невялікіх расказаў, баек, казак, прыказак, прымавак, вершаў, знайшлі адлюстраванне як з'явы навакольнага свету, так і нацыянальны каларыт, умовы жыцця, працы і быту беларускай вёскі, характар і псіхалогія беларускага сялянства. Прасякнутыя рэалізмам і дэмакратызмам кнігі Цёткі з'явіліся своеасаблівым выклікам рэакцыйнай школьнай палітыцы царскага самаўладдзя. «Да Цёткі ніхто з беларускіх пісьменнікаў і паэтаў не займаўся выданнем кніжак для дзяцей. Цётка была піянерам у гэтай справе»[5],— пісала «Наша ніва».

Пасля свайго вяртання на радзіму ў 1911 годзе Цётка зноў актыўна ўключылася ў работу па арганізацыі народных школ. У. Ф. Луцэвіч, жонка Я. Купалы, якая разам з Цёткай арганізоўвала адкрыццё народных школ, успамінала, што ў 1912 годзе на ўскраінах Вільні, у Нова-Вілейцы, на Лідчыне, у тым ліку і ў роднай вёсцы Цёткі дзейнічалі беларускія тайныя школы. «Гэтыя школы, побач з культурна-асветніцкімі гурткамі, набывалі вялікае значэнне, і праз іх ішло распаўсюджванне беларускага друкаванага слова, беларускай нацыянальнай свядомасці»[6]. Асабліва шмат намаганняў для адкрыцця школ на роднай мове прыклала Цётка ў гады першай сусветнай вайны, калі многія пачатковыя школы былі зачынены. Яна збірала дзяцей, шукала настаўнікаў, часта і сама кіравала школьнай работай.

Важнай падзеяй у грамадска-педагагічным жыцці Беларусі было выданне літаратурна-навуковага часопіса для беларускай моладзі «Лучынка», першы нумар якога выйшаў у пачатку 1914 года. Арганізатарам і рэдактарам «Лучынкі» была Цётка, якая з чацвёртага нумару стала падпісвацца «Літаратурны рэдактар Мацей Крапіўка». Перад «Лучынкай» была пастаўлена задача быць настаўнікам моладзі, весці яе да праўды, да ведаў, вучыць з павагай ставіцца да чалавека, самаадданa любіць сваю Айчыну. З гордасцю і павагай гледзячы на «маладых працаўнікоў», Цётка ў той жа час шкадуе, што не хапае «навукі ў тваёй роднай беларускай мове, якая табе паказала б, растлумачыла б, хто ты такая, беларуская моладзь, да якога ты належыш народу і краю»[7]. Цётка прыцягнула да ўдзелу ў выданні часопіса прагрэсіўна настроеных аўтараў, асабліва моладзь. Яна звярнулася з лістом да студэнтаў-беларусаў, у якім пісала: «Браткі-студэнты! Не маеце права атрасці рукі ад працы у «Лучынцы»; на вашым сумленні будзе ляжаць найбольшая частка сораму, калі «Лучынка» будзе дрэнна свяціць вашым братам і сёстрам у вёсцы беларускай, што для вас сеюць і жнуць»[8].

Праз часопіс Цётка праводзіла ў жыццё свае педагагічныя ідэі, удзяляючы вялікую ўвагу мове выкладання, дабіваючыся яе прастаты і сцісласці. У артыкуле «Шануйце роднае слова» яна звярнулася да моладзі з заклікам імкнуцца да ўзбагачэння роднай мовы, бо яна, «быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае і найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць»[9]. Родная мова аб'ядноўвае людзей «у суцэльны народ».

Царская цэнзура, змагаючыся супраць распаўсюджвання прагрэсіўных педагагічных ідэй, перашкаджала «Лучынцы» стаць сапраўдным настаўнікам моладзі. Аб цяжкасцях выдання часопіса Цётка пісала ў лісце да Б. Эпімаха-Шыпілы ў лютым 1914 года: «Клікніце кліч між беларускай моладзі, хай бяруцца да працы для пакіненых братоў і сёстраў у вёсцы. Студэнцкая моладзь суседніх нам народаў — украінцаў і літоўцаў шмат робіць для вясковай моладзі»[10]. Царскі ўрад хутка забараніў выданне «Лучынкі»: выйшла толькі 6 нумароў часопіса. Аднак, дзякуючы Цётцы, у Беларусі ўпершыню было пастаўлена пытанне аб неабходнасці стварэння спецыяльнага перыядычнага органа для дзяцей і юнацтва на беларускай мове.

Сваёй творчасцю і асветніцка-педагагічнай дзейнасцю Цётка імкнулася даказаць, што родная мова заўсёды з'яўлялася і будзе з'яўляцца для народа магутным сродкам распаўсюджвання адукацыі, правадніком ведаў. Дзякуючы развіццю і распаўсюджванню роднай мовы расце і нацыянальнае адраджэнне беларускага народа.

Асветніцкая дзейнасць і прагрэсіўныя педагагічныя погляды Цёткі, як і шэрагу іншых прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага адраджэння, заклалі асновы развіцця нацыянальнай беларускай школы і былі выкарыстаны пры стварэнні беларускай савецкай школы пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Закладзеныя Цёткай педагагічныя традыцыі стварэння вучэбнай літаратуры для дзяцей на роднай мове набылі далейшае развіццё ў перыяд «беларусізацыі» рэспублікі (20-я—пачатак 30-х гадоў). Ідэі і погляды Цёткі і другіх рэвалюцыйных дэмакратаў вельмі актуальныя сёння, калі перад беларускім народам паўстала задача пашырыць сферу прымянення роднай мовы, стварыць для яе функцыяніравання самыя спрыяльныя ўмовы ва ўсіх сферах жыцця.

[1] Наша ніва. 1907. № 27.
[2] Цётка. Творы. Мінск. 1976. С. 204, 203.
[3] Там жа. С. 274.
[4] Цётка. Першае чытанне для дзетак беларусаў. Пб., 1906. С. 19.
[5] Цыт. па кн.: Арабей Л. Цётка. Мінск. 1956. С. 136.
[6] Луцэвіч У. Успаміны пра Цётку // Полымя. 1966. № 4. С. 129.
[7] Цётка. Творы. С. 213.
[8] Там жа. С. 276.
[9] Там жа. С. 217.
[10] Там жа. С. 277.

С. М. ПРОХОРОВА, Н. В. ФЕДОТОВА, С. В. МАХОНЬ

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ КОМПЬЮТЕРНОЙ ПРОГРАММЫ В САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЕ СТУДЕНТОВ

Программа «Формально выраженная коннотация в русском языке», составленная авторами, используется для самостоятельной работы иностранных и советских студентов[1]. Кроме того, эта программа помогает преподавателю осуществлять контроль за индивидуальной работой обучающихся, так как в нее заложена возможность быстро и эффективно оценивать знания каждого студента и учитывать количество правильно выполненных заданий.

В программу не вводятся задания по формально не выраженным коннотациям, ибо их анализ труден даже для носителей языка. Можно согласиться с П. А. Лекант в том, что «коннотации трудны для лингвистического анализа, так как обычно не имеют прямого материального выражения»[2].

Во вводной лекции излагаются различные подходы отечественных и зарубежных ученых к проблеме коннотации, подчеркивается, что главным в этой проблеме остается вопрос о сущности коннотации. Большинство ученых связывает коннотацию прежде всего с эмотивностью. Получило признание утверждение Д. Н. Шмелева о том, что эмоциональные факторы являются одним из источников семантического развития языка. Эмоциональный фактор не исключают из лингвистики В. А. Звегинцев и Р. Якобсон. В. И. Шаховский утверждает, что коннотация — это эмотивный компонент. Исследователь определяет эмотивность как «имманентно присущее языку свойство выражать лексически эмоциональные отношения говорящих к объектам мира их окружения: презрение, возмущение и т. п., ласку, восхищение и т. п.». Коннотация, утверждает В. И. Шаховский, «как компонент лексического значения слова есть эмоциональная окраска логико-предметного ядра содержания слова, «добавка», отражающая видовой эмоциональный опыт — след прежней деятельности человека, сопровождающийся определенными эмоциональными реакциями»[3].

На наш взгляд, не менее важными для коннотации являются ассоциативные поля, несомненно в некоторых точках пересекающиеся с эмотивными. Благодаря ассоциации возникают исторические, национальные, поэтические и др. коннотации.